ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУА «Віцебскае кадэцкае вучылішча»
С.М.Лагвіненка
«20» мая 2016 г.

**Заданне**
**па беларускай мове**
**9 класс**

**Жыццё ў вадаёме**

У цёплы летні вечар над вадой снуюць кволыя падзёнкі, падобныя да вялікіх камароў. Падзёнкі – прывабная здабыча для рыбы. Акуні, плоткі,язі, ляшчы выскокваюць з вады, хапаючы падзёнку ў паветры.

У ціхай, прагрэтай сонцам вадзе плаваюць сярод зараснікаў каля берага залацістыя карасі. Яны кормяцца лічынкамі камароў і вадзянымі раслінамі.

Маладыя акуні чародкамі плаваюць між трысця, а буйнейшыя з іх шукаюць здабычу ў глыбокіх мясцінах, хапаючы без разбору ўсё, што можна праглынуць: дробных рыбак, і чарвякоў, і насякомых, і рачкоў.

На самым дне вадаёма, у глыбокай цёмнай яміне, ляжыць, як калода, вусаты сом. Ён пільнуе тут здабычу. Гэтая вялізная, тлустая і непаваротлівая рыбіна можа праглынуць нават качку. Тут жа, на дне, корпаючыся ў глеі ці хаваючыся ў зарасніках, праводзіць час і лянівы лінь. (124 словы) (Паводле В.Вольскага)